відбутися в результаті дій. Активність складається з пошуку дій, які перетворюють наявну ситуацію в шукану, потрібну, тобто в ту, яка відповідае задоволенню потреб, або досягнення мети.

Разом з тим необхідно брати до уваги творчу самостійність, провідну роль педагога в організації навчальноі діяльності, а також зв'язок вузу з соціально-культурним життям у регіоні, міцність і діевість культурологічних знань, умінь і навичок у професійній діяльності.

Змісту і завданням сучасноі мистецкоі освіти більш за все відповідае творчо-активний принцип навчання. В освітній практиці принцип творчоі активності розглядається як найвищий ступінь мотивованого навчання, яке втілюється в першу чергу в різноманітні творчі завдання.

Діяльність вищих навчальних закладів культури і мистецтва повинна бути спрямована на пошуки нових форм, використання прогресивних педагогічних методик і технологій, запровадження передового педагогічнього досвіду з метою піднесення на якісно вищий рівень професійного навчання студентів.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**В.М.Глубачэнка,** *дацэнт*

## ІМПРАВІЗАЦЫЯ І СТАНДАРТЫ ВЫШЭЙШАЙ МУЗЫЧНАЙ АДУКАЦЫІ

Сістэма вышэйшай музычнай адукацыі ў нашай краіне мае добрыя традыцыі. Беларускія музыканты не аднойчы займалі ганаровыя месцы на шматлікіх міжнародных конкурсах і фестывалях. Аднак у апошні час у адрас вышэйшай школы ўсё часцей чуюцца крытычныя заўвагі. Маўляў, музычная школа страціла ўзнёслы дух творчасці, адарвалася ад жыцця, не паспявае за сучасным развіццём падзей у свеце. Сапраўды, дэвальвацыя духоўных

каштоўнасцей у грамадстве не абышла і музычныя ВНУ, якія працягваюць рыхтаваць кадры ў асноўным так, як рыхтавалі іх 20—30 гадоў таму назад, быццам не заўважаючы, што ўсё навокал даўно не тое, што ў музычнай культуры пануюць іншыя тэндэнцыі. У сучаснай складанай і вельмі дынамічнай сацыякультурнай сітуацыі наспела пытанне аб грунтоўным пераглядзе прынцыповых пытанняў арганізацыі музычнага выхавання, распрацоўцы новых адукацыйных стандартаў, якія адпавядалі б патрабаванням часу, дазвалялі б весці падрыхтоўку спецыялістаў высокакваліфікаваных не толькі па сённяшніх мерках, але і ў перспектыве.

Пры распрацоўцы вучэбна-адукацыйных стандартаў трэба зыходзіць перш за ўсё з патрабаванняў практыкі. Што павінен уяўляць сабой спецыяліст? Якія яму неабходна мець якасці, здольнасці? Якімі ўменнямі, навыкамі павінен валодаць? Што за віды дзейнасці, на якім узроўні яму належыць выконваць?

Што датычыць пытанняў мастацкай адукацыі, то тут цяжка рэгламентаваць пералік прафесійна значных характарыстык спецыяліста. Бо, на наш погляд, галоўным стандартам у мастацкай, і ў тым ліку музычнай галіне, як ні парадаксальна гэта гучыць, з'яўляецца ўменне мысліць нестандартна.

Калі кажам аб падрыхтоўцы музыканта-творцы, маем на ўвазе фарміраванне ў будучага спецыяліста самастойнага прадуктыўнага мыслення, багатай фантазіі, інтуітыўнага спасціжэння рэчаіснасці, што дазваляюць прымаць рашэнні ў самых складаных канкрэтна-сітуацыйных умовах. З усіх відаў музычнай дзейнасці імправізацыя характарызуецца найбольшай творчай насычанасцю. Менавіта яна прадугледжвае абавязковае ўключэнне ў працэс творчасці асобы музыканта ў адзінстве фізічных, інтэлектуальных і духоўных сіл. Якраз імправізацыя найлепшым чынам садзейнічае выяўленню і развіццю творчых магчымасцей музыканта.

Імправізацыю трэба разглядаць не толькі як эфектыўны сродак развіцця творчага патэнцыялу асобы. Патрабаванне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўключэння навыкаў і ўменняў імправізаваць у разрад прафесійна значных якасцей музыкантаў рознага профілю грунтуецца на ўсведамленні функцый адпаведнай дзейнасці ў іх рабоце. Беглы позірк на месца імправізацыі ў найбольш распаўсюджаных накірунках занятасці музыканта дазволіць пераканацца ў тым, што яе засваенне ў сучасных умовах далёка не раскоша, а першачарговая задача музычных навучальных устаноў.

Добра вядома, што ўменне імправізаваць значна ўзбагачае выканальніцкія магчымасці музыканта, дазваляе лепей зразумець ідэю твора, больш аб'ектыўна ацаніць яго мастацкую вартасць. Акрамя таго, сучаснага выканаўцу незалежна ад таго, саліст ён, артыст аркестра ці ўдзельнік ансамбля, часта ставяць ва ўмовы, якія вымушаюць звяртацца да імправізацыі. (Гаворка ідзе аб некаторых накірунках сучаснай акадэмічнай музыкі — санарыстыцы, пуантылізме, музыцы тэмбраў і інш.) Усе яны ў значнай меры прадугледжваюць, нават патрабуюць ад выканаўцы выяўлення імправізатарскіх магчымасцей. Народная і паліфанічная музыка таксама даюць шырокае поле імправізатарскай творчасці. Аб папулярнай музыцы і джазе нават казаць не трэба: усе добра ведаюць аб тым, што наяўнасць імправізацыі з'яўляецца адной з галоўных умоў іх існавання.

У творчасці канцэртмайстра імправізацыя таксама займае значнае месца. Зразумела, прысутнасць яе шмат у чым залежыць ад музычнага накірунку, формы дзейнасці музыканта. Напрыклад, у класічнай музыцы выкарыстанне імправізацыі было б не да месца. У той жа час народная, лёгкая, альтэрнатыўная музыка змяшчае ў сабе магчымасць, нават патрабуе актыўнага разгортвання імправізацыі. Без яе не абысціся пры рабоце ў дзіцячых аздараўленчых лагерах або дамах адпачынку, абслугоўванні святочных мерапрыемстваў і інш.

Студэнты, зарыентаваныя на атрыманне прафесіі выкладчыка, павінны добра ўсведамляць тое, што адной з



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

галоўных тэндэнцый сучаснага музычнага выхавання ў свеце прызнана тэндэнцыя да павелічэння ролі творчага музіцыравання або музычна-прадуктыўнай дзейнасці ў фарміраванні асобы навучэнца. Навукова-метадычныя, практычныя дасягненні айчынных і замежных даследчыкаў, педагогаў сведчаць аб тым, што заняткі імправізацыяй павышаюць эфектыўнасць вучэбнага працэсу, садзейнічаюць узнікненню ўстойлівай цікавасці да музычнай справы, абуджаюць творчы патэнцыял вучня, спрыяюць яго самарэалізацыі. Вымушаны канстатаваць: на сённяшні дзень айчынная сістэма музычнай адукацыі вельмі марудна, непаваротліва падыходзіць да вырашэння акрэсленай праблемы. Прычым інертнасць і, шчыра кажучы, безадказнасць выкладчыкаў у дачыненні беларускай музычнай культуры прасочваецца аднолькава ва ўсіх звеннях навучання.

Характэрнай з'яўляецца тая акалічнасць, што ў асяроддзі педагогаў няма адзінай думкі наконт таго, калі трэба пачынаць заняткі па імправізацыі. Тэорыя адназначна вырашае гэтае пытанне: вучыць імправізаваць трэба з першых крокаў, у данотны перыяд навучання. Аднак педагогі музычных школ у большасці сваёй не пагаджаюцца з апошнім тэзісам. Іх пазіцыя грунтуецца на тым, што, каб вучыцца імправізацыі, варта валодаць адпаведнымі навыкамі. У выкладчыкаў ВНУ свае аргументы: калі ў студэнта адсутнічаюць імправізатарскія навыкі, то пачынаць з нуля ў гэтым узросце цяжка. Складанасці звязаны не толькі з тым, што страчаны час для развіцця, але і з тым, што паўстае комплекс узроставых фактараў, якія перашкаджаюць і стрымліваюць вырашэнне праблемы.

Калі ёсць разуменне таго, што імправізацыя ўваходзіць у сістэму прафесійна значных навыкаў, і цвёрдая ўпэўненасць у неабходнасці адпаведных заняткаў, не маем права ігнараваць гэта. Не прынцыпова тое, ці ўмеем імправізаваць, ці ведаем методыку выкладання імправізацыі. Вырашальным фактарам у дадзеных умовах з'яўляецца

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

патрабаванне часу. Кожны выкладчык незалежна ад таго, у якім са звенняў музычна-выхаваўчай сістэмы працуе, павінен усведамляць: адсутнасць заняткаў па імправізацыі вядзе да аднабаковага развіцця навучэнца, негатыўна адбіваецца на прафесійнай адаптацыі, наносіць значную шкоду айчыннай музычнай культуры.

Калі зазірнем у гісторыю музычна-адукацыйнай справы, убачым, што да імправізацыі заўсёды ставіліся неадназначна. Адносіны да яе залежалі ў першую чаргу ад культурна-гістарычных умоў. У той час калі імправізацыя была распаўсюджанай з'явай, займала пачэснае месца не толькі ў музыцы, але і ў паэзіі, драматургіі, школа ставілася да яе належным чынам. Заняткі па імправізацыі тады былі абавязковымі. Напрыклад, у ХУІ—ХУІІІ стст., у перыяд росквіту імправізацыі, без наяўнасці патрэбных навыкаў музыкант не меў шанцу працаўладкавацца. Акрамя таго, лічылася, што імправізацыя станоўча ўплывае на развіццё асобы: будзіць уяўленне, актывізуе творчы пачатак, садзейнічае фарміраванню характару, пашырае кругагляд і ачышчае пачуцці. У ёй бачылі амаль панацэю ад нягод і цяжкасцей, якія існавалі ў тагачасных музычна-педагагічных тэорыі, практыцы.

У антыімправізатарскі перыяд развіцця мастацкай культуры, які акрэсліваецца другой паловай XIX—пачаткам XX ст., панавала меркаванне, што імправізацыя быццам бы псуе густ, выклікае падзенне нораваў, стварае халтуру. Да яе ставіліся як да шкоднай справы, што не мае дачынення да "высокага" мастацтва.

Цяпер імправізацыя зноў знаходзіцца ў цэнтры ўвагі музыкантаў і спецыялістаў у галіне музычнай адукацыі. З ёй ізноў пачынаюць звязваць самыя перспектыўныя і эфектыўныя шляхі музычнага выхавання. Вышэйшая школа не можа заставацца ўбаку ад акрэсленых праблем. Наадварот, якраз музычныя ВНУ павінны ў наш час абвясціць аб сваім лідэрстве ў пытаннях адраджэння імправізацыі ў вучэбна-выхаваўчым працэсе. Іншага шляху



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

зараз няма. Чым хутчэй з'явіцца разуменне важнасці імправізацыі ў прафесіяналізме сучаснага музыканта, таго, што без заняткаў імправізацыяй нельга гаварыць аб эфектыўным практычным навучанні, тым хутчэй айчынная сістэма музычнай адукацыі пераадолее цяжкасці, стане адпаведнай сусветнай канцэпцыі музычнага выхавання.

**Л.Ф.Голікава,** *дацэнт*

## ЦЫКЛ МУЗЫЧНЫХ ГІСТОРЫКА-АНАЛІТЫЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІН У МЕЖАХ СТАНДАРТАЎ ПА СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ "СУСВЕТНАЯ І АЙЧЫННАЯ МАСТАЦКАЯ КУЛЬТУРА"

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У наш час, калі ў Рэспубліцы Беларусь праводзіцца рэформа вышэйшай адукацыі, увядзенне адукацыйных стандартаў, прызначэнне якіх у выпрацоўцы аптымальных патрабаванняў да ўзроўню падрыхтоўкі спецыялістаў, вельмі актуальнае.

Характэрнай асаблівасцю стандартаў вышэйшай адукацыі, адрозненнем іх ад традыцыйных праграм з'яўляецца тое, што, з аднаго боку, яны становяцца фундаментам, на якім могуць паспяхова рэалізоўвацца педагагічныя канцэпцыі і ідэі. З другога боку, адукацыйныя стандарты (у чым заключаецца адзін з важнейшых прынцыпаў стандартызацыі ў сферы адукацыі) арыентаваны на канчатковы вынік вучэбнага працэсу і адкрываюць мноства магчымасцей плённай творчай дзейнасці навучэнца і выкладчыка.

Спецыяльнасць "сусветная і айчынная мастацкая культура" прадугледжвае падрыхтоўку спецыяліста-мастацтвазнаўцы шырокага профілю, прыстасаванага як да мастацка-творчай, арганізацыйна-кіраўніцкай, навукова-даследчай работы, так і да педагагічнай дзейнасці.